В. М. Удавічэнка Т. А. Кавальчук

# ЧАЛАВЕК і СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 1 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне, перапрацаванае

Мінск «Народная асвета» 2012

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

УДК [502+3+613](075.2=161.3)
ББК 20.1я73
У28

Пераклад з рускай мовы *Н. М. Алганавай*

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры *А. Г. Сарока*); настаўнік пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 105 г. Мінска» *В. Г. Антонава*

Умоўнае абазначэнне

 — чытае настаўнік

**Удавічэнка, В. М.**
У28 Чалавек і свет : вучэб. дапам. для 1-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. М. Удавічэнка, Т. А. Кавальчук ; пер. з рус. мовы Н. М. Алганавай. — 2-е выд., перапрац. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 102 с. : іл.
ISBN 978-985-03-1892-3.

**УДК [502+3+613](075.2=161.3)**
**ББК 20.1я73**

**ISBN 978-985-03-1892-3**

© Удавічэнка В. М., Дурэйка Л. І., 2006
© Удавічэнка В. М., Кавальчук Т. А., 2012, са змяненнямі
© Алганава Н. М., пераклад на беларускую мову, 2012
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2012

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# УВОДЗІНЫ

## Наша Радзіма — Беларусь










Правообладатель Народная асвета

## Наша Радзіма — край блакітных рэк, азёр і лясоў




Ёсць лес — беражы,
многа лесу — не сячы,
мала лесу — пасадзі.



Правообладатель Народная асвета






Правообладатель Народная асвета

# Прырода і чалавек

## Што такое прырода.
## Жывая і нежывая прырода





У гаі-гаёчку
між травы, расы —
сінія званочкі.

Іх шануюць дзеці,
каб такой красы
больш было на свеце.

*М. Пазнякоў*



Правообладатель Народная асвета



Гарлачык белы



Крыжадзюб







Правообладатель Народная асвета

# Асеннія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека

## Змяненні ў нежывой прыродзе восенню. Расліны ўлетку і ўвосень





Правообладатель Народная асвета









Правообладатель Народная асвета

## Залатая восень. Разнастайнасць асенняй афарбоўкі лісця дрэў і кустоў





Правообладатель Народная асвета

## Расліны — частка жывой прыроды. Разнастайнасць і прыгажосць дрэў, кустоў, травяністых раслін



Асіна



Каліна



Рамонак

---





Дрэвы





Кусты





Травы

Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

# Паспяванне пладоў і насення



Дуб





Клён



Рабіна





Каліна





Бяроза





Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

## Загадка

Стаіць у лесе дрэўца,
Пад ветрам лёгка гнецца,
Гронкі ягадак гарацць,
Снегіры да іх ляцяць.











Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

# Уплыў змяненняў у прыродзе на жыццё чалавека восенню. Як правільна апранацца восенню, загартоўваць арганізм







Правообладатель Народная асвета





 Лепш дыхаць свежым паветрам, чым піць лякарства.
Пешшу хадзіць — даўжэй жыць.



Прагулкі і гульні на свежым паветры восенню гартуюць арганізм, робяць чалавека дужым, лоўкім. Для асенніх прагулак трэба апранацца ў адпаведнасці з надвор'ем. Адзенне і абутак павінны быць лёгкімі, але цёплымі і непрамакальнымі. Калі адзенне і абутак прамоклі, трэба хутка вяртацца дадому.



Правообладатель Народная асвета

## Асеннія плады і насенне — крыніца вітамінаў

Лясныя ягады — скарбніца здароўя.



Сядзіць паненка.
На ёй чырвоная сукенка.
Хто ў лес ідзе,
кожны ёй паклоніцца.



Мы чырвоныя, кіслыя,
на балотах расцём,
пад снегам дазраваем,
у роце песенькі спяваем.



Зялёныя кусцікі,
пунсовыя кветкі.
Кіпці-кіпцюры
сцерагуць плады.



Што за пацерачка тут,
на сцябле, павісла?
Глянеш — слінкі пацякуць,
а раскусіш — кісла.



Паміж бяроз
на кусце рос.
Як спелым стаў,
на зуб папаў.

Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

## Агароднiна i садавiна.
## Правiлы ўжывання агароднiны i садавiны

У агароднiне магутная сiла.



Каб здаровым, дужым быць,
трэба агароднiну любiць
усю, без выключэння,
гэта без сумнення *(паводле Н. Сямёнавай).*





Каб дактароў не турбаваць,
трэба мiкробаў заўсёды змываць.
Мыты яблык ярчэй зiхацiць,
ды i жывот ад яго не балiць.
*(Паводле В. Жураўлёвай)*



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Правілы асабістай гігіены. Догляд зубоў, ногцяў і валасоў



Гарачая, халодная
Усім патрэбна я.
Паклічаш — пабягу,
Ад хвароб зберагу.

Часцей мыйся, вады не бойся.
Хвароба з чысцінёйварагуе.
















Правообладатель Народная асвета

Рукі мый пасля гульні,
транспарту і туалета.
З вуліцы прыйшоў — і зноў
трэба памятаць пра гэта.
На ўсіх закон адзін:
мыем рукі — пасля ядзім.
Ад вады і мыла
мікробы губляюць сілы.



Будзь акуратны, забудзься на лень, чысці зубы двойчы ў дзень.



Памятай! Зубы неабходна чысціць раніцай і вечарам пасля яды. Пасля любых страў, асабліва салодкіх, трэба паласкаць рот вадой.



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Рэжым дня школьніка

Рэжым дня — гэта не гульня.
Ён патрэбны ўсім — і вялікім, і малым.

Каб у школе і дома
бадзёрымі быць,
каб здароўе было
ў цудоўным парадку,
зранку кожны павінен выконваць … .





Правообладатель Народная асвета














Падымаюся




Адпачываю пасля школы




Кладуся спаць



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

# Змяненні ў нежывой прыродзе і ў жыцці раслін позняй восенню





Правообладатель Народная асвета

# Дзікія і свойскія жывёлы



Ой, як спрытна,
нібы мячык,
скача з елак на дубы.
На сучках к зіме,
няйначай,
сушыць ягады, грыбы.



Пад хвоямі, пад смолкамі,
па лясных дарожках
бяжыць клубок з іголкамі
на кароткіх ножках.











Правообладатель Народная асвета

# Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл восенню



Пчала





Матыль-крапіўнік





Яшчарка



Восенню становіцца холадна. Знікае корм для матылёў, пчол, яшчарак і іншых жывёл. Некаторыя насякомыя адкладваюць яйцы і гінуць. Іншыя хаваюцца пад кару дрэў, зарываюцца ў зямлю. Змеі і яшчаркі забіраюцца пад карані дрэў, старыя пні.



Правообладатель Народная асвета



Бусел





Ластаўка





Верабей





Пліска



Тэрмін адлёту птушак у вырай залежыць ад наяўнасці корму. Стрыжы і ластаўкі, якія ловяць насякомых у паветры, адлятаюць першымі. За імі адлятаюць пліскі, крыху пазней — шпакі, жаўрукі, жураўлі і буслы. Пазней за ўсіх адлятаюць дзікія гусакі і качкі.



Правообладатель Народная асвета

# Змяненні ў жыцці свойскіх жывёл восенню






















Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

## Уплыў змяненняў у нежывой прыродзе, у жыцці раслін на працу людзей восенню









Дзе справа, там і слава.



Правообладатель Народная асвета

# Асеннія з'явы ў прыродзе
# (абагульняючы ўрок)







Правообладатель Народная асвета





Галка



Шпак



Жураўель



Жаўрук



Правообладатель Народная асвета

# Зімнія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека

## Змяненні ў нежывой прыродзе зімой





Надышлі маразы,
рэчкі закавалі,
белыя бярозы
шэранем убралі.
Мяккая пярына
вочы адбірае.
Белая раўніна —
ні канца, ні краю. *Я. Колас*







Правообладатель Народная асвета

## Як зімуюць расліны

Матылі насіліся,
над зямлёй кружыліся,
а як долу ўпалі —
белым пухам сталі.





Снег — коўдра для раслін зімой. На вуліцы стаяць халады да –20 градусаў. А ў глебе, пад снегам, амаль ніколі не бывае больш за 2 градусы марозу. Снег абараняе ад марозу пасевы азімых і пупышкі зімуючых траў.



Правообладатель Народная асвета

## Хваёвыя, ліставыя дрэвы і кусты зімой. Каго корміць дрэва ўзімку. Клопат чалавека аб ахове дрэў



Зімой паспявае насенне ў елкі і сасны. Крыжадзюбы выводзяць птушанят у зімовыя халады. Маці не пакідае гняздо. Яна саграває птушанят сваім цяплом. А крыжадзюб-бацька корміць малых і маці насеннем елкі і сасны.



Правообладатель Народная асвета

# Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл зімой





Снягір

## Снегіры

Снег глыбокі двор накрыў,
прыляцелі снегіры.
— Есці хочам — фіц-фіц-ціў,
хто б нас трошкі пакарміў?..

*М. Парахневіч*



Сініца





Ластаўка



Верабей



Сарока

Зімой птушкі пакутуюць не ад холаду, а ад голаду. Калі птушка сытая, то ніякі мароз ёй не страшны. Дапамагай нашым сябрам у гэты цяжкі для іх час. Сачы, каб у кармушцы для птушак заўсёды быў корм.



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Спіць зімою да вясны
соладка жыхар лясны.
Сніць не снег ён і не лёд,
а духмяны, смачны мёд.

Гарбаносы, даўганогі
велікан зімой бязрогі.
Калі сустрэць такога давялось,
знайце, дзеці, гэта … .







Правообладатель Народная асвета



Варона Верабей Лось Заяц-бяляк





Калі з раніцы чуецца дружны піск сініц — будзе моцны мароз.

Калі заяц скача, то заносіць заднія ногі далёка наперад. Ад іх і застаюцца на снезе ямкі, большыя па памеры, чым сляды ад пярэдніх ног. Па слядах можна дабрацца да зімовага прытулку зайца. Гэта прадаўгаватая ямка. У ёй заяц хаваецца і ад ворагаў, і ад ветру.



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Свойскія жывёлы зімой

Ці то ў будні, ці то ў святы —
носіць свой кажух багаты.
Не прадзе, не тчэ,
а людзей апранае.

Замест хвосціка — кручок,
замест носа — пятачок,
пятачок дзіравы,
а кручок вяртлявы.







Правообладатель Народная асвета





Зімой свойскія жывёлы ўтрымліваюцца ў памяшканнях. Людзі рупліва працуюць, даглядаючы іх. Некалькі разоў у дзень жывёлам раздаюць корм, падаюць чыстую ваду для піцця, чысцяць памяшканні. Ветэрынары клапоцяцца аб здароўі свойскіх жывёл.



Правообладатель Народная асвета

# Змяненні ў працы людзей зімой









Правообладатель Народная асвета







Ужо зімой людзі клапоцяцца пра будучы ўраджай: вывозяць гной на палеткі, рамантуюць сельскагаспадарчыя машыны ў майстэрнях.

Ідзе праца ў сховішчах для агародніны, збожжасховішчах, цяпліцах.

У гарадах вуліцы ачышчаюць ад снегу.



Правообладатель Народная асвета

Народная асвета

## Клопат чалавека аб сваім здароўі зімой. Як правільна апранацца

Спрытнага і лоўкага хвароба
не дагоніць.







Льецца рэчка —
мы ляжым.
Лёд на рэчцы —
мы бяжым.

Бягуць па дарожцы
дзве дошкі ды ножкі.

Для ўмацавання здароўя і загартоўкі арганізма вельмі карысны зімнія прагулкі і рухавыя гульні. Катацца на каньках, гуляць у хакей трэба на спецыяльных катках. Прагулкі карысныя ў любое надвор’е, толькі не ў маразы і не ў завіруху. Для зімніх прагулак і гульняў патрэбны лёгкія, але цёплыя адзенне і абутак.



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

## Як правільна загартоўваць арганізм зімой

Хто з загартоўваннем сябруе,
той ніколі не сумуе.








Каб не хварэць, трэба кожны дзень загартоўваць свой арганізм. Раніцай карысна аблівацца халаднаватай вадой, абцірацца вільготным ручніком. Трэба рэгулярна рабіць зарадку, гуляць на свежым паветры. Карысна плаваць у басейне. Загартовачныя працэдуры дапамагаюць перамагчы прастуду, дораць добры настрой.

Нельга хадзіць у школу, у госці, калі нездаровы. Пры чыханні, кашлі трэба абавязкова прыкрываць рот і нос хустачкай.



Правообладатель Народная асвета

# Зімнія з’явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок)







Правообладатель Народная асвета







Правообладатель Народная асвета

# Вясеннія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека

## Ранняя вясна. Сакавік — першы месяц вясны



Сакавік — першы месяц вясны. На зямлі яшчэ ляжыць снег. Надвор'е па-ранейшаму марознае. Але сонца свеціць па-вясенняму ярка. Пад яго прамянямі пачынае раставаць снег. Неба блакітнае-блакітнае. З'яўляюцца першыя праталіны. У палях і на дарогах журчаць першыя ручаі.

Праталіны, ручаі, больш яркае, чым зімой, сонца — прыметы надыходзячай вясны.



Правообладатель Народная асвета

# Асцярожна — крыгаход! Вясенні разліў рэк (паводка). Правілы паводзін каля вадаёмаў вясной







Правообладатель Народная асвета

# Вясна — час абуджэння раслін. Раннеквітнеючыя расліны — корм для насякомых



На бярозе яшчэ толькі набракаюць пупышкі. І раптам дзіва: на голай зямлі — пяшчотныя кветкі пералескі. Пазней зацвітаюць падбел і кураслеп. Усе гэтыя расліны цвітуць вясной. Іх нектарам кормяцца чмялі, пчолы, матылі.

Зрываць кветкі раннеквітнеючых раслін нельга.



Правообладатель Народная асвета

## Беражлівыя адносіны да першацветаў

### Пралеска

Белыя бярозы спалі на ўзлеску,
як сваю галоўку ўзняла пралеска.
Тоненькую ножку з-пад пярыны белай
на зямлю пралеска ставіла нясмела.
А снягі наўкола — ні канца ні краю.
Страшна стала кветцы:
«Я адна — жывая…»

*В. Вярба*



Кураслеп лясны



Пералеска высакародная



Падбел



Сон лугавы



Правообладатель Народная асвета

# Выкарыстанне жыватворнай сілы прыроды вясной. Прагулкі і гульні ў парку, скверы









Вясной карысна штодзень гуляць на свежым паветры. Ранняй вясной сыра і халаднавата. Апранацца трэба так, каб не змерзнуць і не прамачыць ногі. Калі гуляць з мокрымі нагамі, можна захварэць.

Вясной трэба есці больш зеляніны: зялёнай цыбулі, салаты, шчаўя, пятрушкі, кропу. У іх шмат вітамінаў.



Правообладатель Народная асвета

# Бяспечныя месцы для гульняў







Можна





Нельга





Вучыся правільна выбіраць бяспечныя месцы для гульняў і прагулак.



Правообладатель Народная асвета

## Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл вясной. Прылёт птушак



Жаўрук і шпак



Ластаўка



Пліска

Як толькі на палетках з'яўляюцца першыя праталіны, прылятаюць жаўрукі і шпакі. Яны шукаюць на праталінах насенне траў і насякомых. Пліску ў народзе празвалі «ледаломкай». Гэтыя птушкі прылятаюць, калі на рэках пачынаецца крыгаход. Прылёт ластавак супадае з масавым вылетам насякомых.



Правообладатель Народная асвета

## Гнездаванне птушак



Грак

Малінаўка

Жаўрук

Салавей

### Птушыныя спевы

Пяюць на дрэве салавей,
малінаўка і дрозд:
«Ты гнёздаў нашых не чапай,
не руш птушыных гнёзд!
І ведай: дрэвы ўсе і кветкі
не перастаюць чакаць,
калі малыя нашы дзеткі
паціху запішчаць».

*З. Аляксандрава*



Правообладатель Народная асвета

## Змяненні ў жыцці насякомых і іншых жывёл вясной



Спрытна скача, плавае
І заўзята квакае.
Языком сваім жвава
Ловіць камароў ... .



Каля сосен, каля елак
збудаваны дом з іголак.
Можа, ваш знаёмы ён?
Жыхароў у ім мільён.



Маленькі жучок —
чырвоная спінка,
у крапачках чарнявых,
нібы намаляваных.



Ён вялікі і калматы,
у камізэльцы паласатай.
У норцы пад зямлёй жыве
і нектар духмяны п’е.

Чмялі вылятаюць ранняй вясной. У гэты час мала насякомых. І гэтыя жывёлы, апыляючы расліны, прыносяць карысць. Веснавое сонца абудзіла мурашак. Яны знішчаюць шкоднікаў раслін, дапамагаюць чалавеку ахоўваць лясы. Рапуха — безабаронная, карысная жывёла. Выпаўзае на паляванне, калі сцямнее. Паядае шмат смаўжоў і насякомых.



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Змяненні ў жыцці дзікіх звяроў вясной



Вясной з’яўляюцца дзіцяняты ў вожыкаў. Часцей за ўсё іх бывае 4—5. Нованароджаныя вожыкі слабыя, сляпыя і зусім не калючыя. Маці пяшчотна клапоціцца пра іх і храбра абараняе. Вожыкі паядаюць мышэй, змей, смаўжоў і вусеняў. Не лаві і не трымай у няволі гэтых карысных жывёл.



Прачнуўся і выйшаў з нары барсук. Першыя самастойныя крокі робяць і барсучаняты. Яны рыюцца ў глебе, шукаюць чарвячкоў, лічынак. Вучацца паляваць на мышэй. Дзіцяняты грэюцца на сонцы, а барсучыха сядзіць побач. Толькі заўважыць небяспеку — імгненна барсучанят у нару схавае і сама туды забярэцца.



Правообладатель Народная асвета

## Змяненні ў жыцці свойскіх жывёл вясной

Не кароль, а ў кароне,
не гусар, а пры шпорах.
Гадзінніка не мае, а час знае.

Не араты, не каваль, не плотнік,
а першы на вёсцы работнік.



Ягня

Кураня



Жарабя

Цяля

Куры — свойскія птушкі. Лятаць яны не ўмеюць. Ад ворага ратуюцца ўцёкамі. Кураняты, як толькі вылупяцца з яец і крыху падужэюць, ходзяць следам за маці. Пры небяспецы курыца-маці хавае птушанят пад крыламі.



Правообладатель Народная асвета







Правообладатель Народная асвета

# Праца людзей вясной









Правообладатель Народная асвета







Хто спіць вясной — плача зімой.



Правообладатель Народная асвета

## Уплыў людзей на жыццё раслін і жывёл. Неабходнасць аховы раслін, жывёл роднага краю



Не рві ў прыродзе кветак для букетаў.



Не ламай галінак.



Не лаві матылёў.



Вучыся бачыць прыгажосць прыроды.



Правообладатель Народная асвета



Не кідай у вадаёмы смецце.



Не лаві
і не знішчай
павукоў і жукоў.



Не лаві
рапух і жаб.



Не разбурай
гнёздаў.



Правообладатель Народная асвета

# Вясеннія з’явы ў прыродзе
# (абагульняючы ўрок)









Правообладатель Народная асвета



Давайце пройдземся павольна па лузе...
І «Добры дзень!» — мы скажам
мілым кветкам…
Да кожнай кветачкі гатоў я нахіліцца —
не для таго, каб рваць яе, зразаць!
А добрым тварам кветкі падзівіцца —
добры твар свой паказаць!

*С. Вургун, пераклад Л. Курбекі*



Правообладатель Народная асвета

# Змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека летам

## Змяненні ў нежывой прыродзе летам



### Залаты праменьчык

Залаты праменьчык, сонечны агеньчык,
Цэлы дзень працуе, кветачкі малюе:
Макі-матылёчкі, у полі васілёчкі
І каля крынічкі пчолкам медунічкі.

Залаты праменьчык, сонечны агеньчык,
Цэлы дзень працуе, ягадкі малюе:
Лясную сунічку, хатнюю клубнічку,
Вішаньку, малінку, ягадку калінку.

*Я. Жабко*



Правообладатель Народная асвета

# Летнія навальніцы



Два браты родныя: аднаго ўсе бачаць ды не чуюць, другога ўсе чуюць ды не бачаць.





Правообладатель Народная асвета

Шырокаю дугою стала над лясамі.
Колькі колераў у ёй, мы падлічым самі.



У чэрвені сонца ў поўдзень займае самае высокае становішча над зямлёй. Становіцца цяплей. Павышаецца тэмпература вады ў вадаёмах.

Летнія дажджы часта моцныя, але цёплыя і кароткія. Часам бываюць навальніцы: бліскаюць маланкі, грыміць гром. Але праходзіць дождж, навальніца, і зноў свеціць яркае сонца. Падчас навальніцы нельга хавацца пад асобна стаячымі высокімі дрэвамі.



Правообладатель Народная асвета

## Расліны летам: цвіценне траў, пасяванне ягад





Першы летні месяц — чэрвень — месяц кветак. Хістаюцца ад ветру ліловыя званочкі, цвіце чырвоная канюшына, рамонак, мышыны гарошак і многія іншыя расліны. У чэрвені паспяваюць ягады суніц, у канцы чэрвеня, ліпені — ягады чарніц, у канцы ліпеня, жніўні — ягады малін і ажын.



Правообладатель Народная асвета

## Ядавітыя расліны

Чорнае вока
Глядзіць з травы навокал.
Ляжыць ягада ў разетцы —
Вы яе не ешце, дзеткі.



Мудранка
чатырохлістая



Воўчае
лыка

Прыгожая расліна мудранка сустракаецца ў лясах, на берагах лясных рэк і азёр. На адным прамым сцябле растуць адзін супраць другога чатыры лісткі. А паміж імі адна сіне-чорная ягада. Прыгожая ягада, але вельмі атрутная. Ніколі не рві гэтую ягаду і нават не дакранайся да яе!

Воўчае лыка падчас цвіцення лёгка пазнаць па змешчаных прама на сцябле ружовых кветках або па чырвоных ягадах, нібы прыклееных да галінкі.



Правообладатель Народная асвета

# Жыццё свойскіх жывёл летам









Правообладатель Народная асвета

## Жыццё дзікіх жывёл летам, іх клопат пра патомства



Мядзведзіца — клапатлівая маці. Яна вучыць мядзведзянят выкопваць смачныя карані, збіраць ягады.



З самага нараджэння бабраняты — добрыя плыўцы. Але ў вадзе яны любяць катацца на спіне маці.



Правообладатель Народная асвета



Маці вучыць лісянят здабываць корм. Прынясе жывое мышаня, а лісяняты яго ловяць.



Ястраб ахоўвае гняздо, саграВае птушанят і корміць іх.



Правообладатель Народная асвета

# Ахова здароўя чалавека летам. Небяспечныя сітуацыі пры сустрэчы з ядавітымі раслінамі, са змеямі





Чарніцы



Суніцы



Воўчае лыка



Правообладатель Народная асвета



Ландыш



Мудранка



Маліны



У лесе сустракаюцца не толькі ядомыя, але і атрутныя ягады. (Успомні, якія ядавітыя ягады ты ведаеш.) Атрутныя ягады ў воўчага лыка, мудранкі, а таксама ў ландыша. Асабліва небяспечнае воўчае лыка. Нават ад дотыку да зламанай галінкі на скуру можа трапіць яго сок і выклікаць запаленне.



Казялец ядавіты



Клешч



Гадзюка





Правообладатель Народная асвета

## Летняе загартоўванне арганізма. Правілы паводзін каля вадаёмаў і ў вадзе.

### Загар

Сонца, паветра і вада — нашы лепшыя сябры.





Правообладатель Народная асвета

І вее прахалодай
Ад чыстай ад ракі,
І на жывыя воды
Спяшаюць хлапчукі…

І ў дружны хор шчаслівы
Зліваюцца шчыльней
І гоман хваль шумлівых,
І звонкі смех дзяцей.

*Ніл Гілевіч*



Спякотны летні дзень прыемна праводзіць каля ракі або возера. Карысна для здароўя паплаваць, паплюхацца ў цёплай вадзе, пазагараць на залатым пясочку. Купанне ў вадаёмах, сонечныя ванны загартоўваюць арганізм.

Падчас адпачынку каля вадаёма трэба выконваць шэраг правілаў. Купацца можна толькі з дарослымі. Забараняецца купацца, ныраць у незнаёмых месцах. Падчас купання нельга забаўляцца: хватаць адзін аднаго за рукі і ногі, заплываць далёка ад берага.

Загараць карысна не больш за 20 мінут раніцай да дванаццаці гадзін і пасля сямнаццаці гадзін.



Правообладатель Народная асвета

## Змяненні ў прыродзе і працы людзей у розныя поры года (абагульняючы ўрок)



Грэчка зжата. Гола ў полі.
Жыта звезена даўно.
Толькі плаваюць на волі
кучы хмар, як валакно.

Ходзіць дзед белабароды
Полем, лескам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным
блескам.
Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые руні, травы, лозы
Белай воўнаю — кажухам.

*Якуб Колас*



Сонца грэе, прыпякае;
лёд на рэчцы затрашчаў.
Цёплы вецер павявае,
хмар дажджлівых
нам прыгнаў.
Вось і бусел паказаўся,
гусі дзікія крычаць,
шпак на дубе расспяваўся,
жураўлі ужо ляцяць.





Правообладатель Народная асвета

 

Ветрык краскі чуць калыша,
травы шалясцяць.
Луг зялёны жыццем дыша —
конікі трашчаць.
У лозах шчэбет не сціхае,
шум стаіць і свіст,
у яркім бляску спачывае
на ракіце ліст.

*Якуб Колас*





Запомніце, дзеткі:
дрэвы, травы,
птушкі, кветкі
не заўсёды могуць
абараніцца.
Калі будуць знішчаны яны,
на планеце застанемся мы адны.

*В. Берастаў*



Правообладатель Народная асвета

# Чалавек і грамадства

## Мой горад (мая вёска)






Правообладатель Народная асвета






Правообладатель Народная асвета

## Правілы дарожнага руху

### Дарожныя знакі



Пешаходны пераход



Рух пешаходаў забаронены



Рух веласіпедаў забаронены

### Дарога па-за населеным пунктам



Дарога па-за населеным пунктам — небяспечнае месца. Тут няма тратуараў для пешаходаў. Пешаходы павінны хадзіць па абочыне насустрач транспарту, які рухаецца. Так яны лепш бачаць аўтамабілі, якія едуць па шашы.

Нельга гуляць каля дарогі і на праезнай частцы. Ні ў якім разе нельга перабягаць дарогу перад аўтамабілем, які набліжаецца.



Правообладатель Народная асвета

## Правілы пераходу вуліцы. Святлафор

Без языка, без рук —
Вачыма размаўляе.
Чырвоным супыняе рух,
Зялёным — дазваляе.



Вучыся разбірацца сам,
што святлафор сігналіць нам.
Сігнал чырвоны — самы строгі:
«Спыніся! Стой! Няма дарогі!»
А жоўтым вокам заміргае:
«Увага!» — нас засцерагае.
Святло зялёнае гарыць —
адкрыты шлях для вас, сябры!

*Х. Жычка*







Пераходзь вуліцу толькі па пешаходным пераходзе. Уважліва сачы за сігналамі святлафора.



Правообладатель Народная асвета

# Я і мая сям'я.
# Значэнне сям'і ў жыцці чалавека








Правообладатель Народная асвета

## Правы і абавязкі дзяцей і бацькоў. Добразычлівыя адносіны ў сям'і

### Маміны рукі

Слава маміным рукам,
Што работу любяць
І прыносяць сонца нам,
Ласкаю галубяць.

Слава маміным рукам,
Хай на ўсёй планеце
Кветкамі для мілых мам
Расцвітаюць дзеці.

*М. Пазнякоў*



Самыя блізкія для кожнага чалавека людзі — члены яго сям'і. У дружнай сям'і дарослыя дапамагаюць дзецям, а дзеці — дарослым. У дружнай сям'і ніколі не крыўдзяць ні маленькіх, ні дарослых.





Правообладатель Народная асвета

# Небяспечныя сітуацыі дома






На кухні так дапамагай:
Пасуду мый і выцірай,
А газам сам не карыстайся
І да гарачага не дакранайся.

Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

## Сігналы трывогі



Запомні гэтыя нумары і тэлефануй:

- пры пажары **101**
- у міліцыю **102**
- у «Хуткую медыцынскую дапамогу» **103**
- пры ўцечцы газу **104**

Калі будзеш тэлефанаваць, трэба:

- назваць сваё імя, прозвішча і адрас;
- сказаць, што здарылася;
- выслухаць дзяжурнага і адказаць на яго пытанні.

Пры небяспецы падымай трывогу. Прасі дапамогі праз акно. Тэлефануй суседзям, бацькам на працу.



Правообладатель Народная асвета

## НАСТАЎНІКУ

### Заданні для вучняў

### Уводзіны

**Наша Радзіма — Беларусь**

*С. 3.* **1.** Разгледзьце верхні малюнак. Ці ведаеце вы, які горад на ім адлюстраваны? Што знаходзіцца ў цэнтры малюнка? У памяць аб кім пастаўлены гэты помнік? Ці былі вы ў Мінску? Што вы ведаеце аб Мінску? Назавіце галоўны горад нашай Радзімы. Да слоў «галоўны горад» падбярыце другое, блізкае па значэнні слова. (*Сталіца.*) Закончыце сказы: *Наша Радзіма — Рэспубліка* … . *Сталіца нашай Радзімы — горад* … . Якія яшчэ гарады нашай Радзімы вы ведаеце? У якім горадзе (якой вёсцы) жывяце вы? **2.** Разгледзьце Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Што адлюстравана на гербе Рэспублікі Беларусь? Якія колеры на сцягу?

**Наша Радзіма — край блакітных рэк, азёр і лясоў**

*С. 4—5.* **1.** Разгледзьце малюнак, на якім паказаны рэкі, азёры і лясы Рэспублікі Беларусь. Чаму нашу Радзіму называюць краінай зялёных лясоў і блакітных рэк? Разгледзьце яшчэ раз Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь (с. 3). Як вы думаеце, чаму на сцягу і гербе нашай Радзімы ёсць зялёны колер? **2.** Разгледзьце малюнкі раслін (с. 5). Адзначце знакам «+» (з касы лічбаў і літар), якія з дрэў растуць у вашай мясцовасці. Якія яшчэ дрэвы растуць у вашым краі? **3.** Разгледзьце малюнкі жывёл. Адзначце знакам «+» (з касы лічбаў і літар) жывёл, якіх вы бачылі ў прыродзе. Якая з намаляваных жывёл больш за ўсё вам спадабалася? Падрыхтуйцеся расказаць, што вы аб ёй ведаеце. **4.** Паслухайце прыказку і растлумачце, як вы яе разумееце. **5.** Як называецца рака (возера) вашага краю (калі ёсць)? Чым яна (яно) вам падабаецца?

### Прырода і чалавек

**Што такое прырода. Жывая і нежывая прырода**

*С. 6—7.* **1.** Разгледзьце малюнкі на с. 6. Назавіце Нязнайку прадметы жывой прыроды. Адзначце іх знакам «+» (з касы лічбаў і літар). Якія яшчэ прадметы жывой прыроды акружаюць вас дома, на школьным двары (двары дзіцячага сада)? Разгледзьце малюнкі на с. 6—7. Раскажыце Нязнайку, чым вам падабаюцца намаляваныя на іх жывёлы. Як трэба адносіцца да ўсяго жывога? **2.** Паслухайце верш. Якія яшчэ прыгожаквітнеючыя расліны вы ведаеце? Чым яны вам падабаюцца? **3.** Разгледзьце яшчэ раз малюнкі на с. 6. Назавіце Нязнайку прадметы нежывой прыроды. Адзначце іх знакам «–» (з касы лічбаў і літар). Калі сонца саграе зямлю больш моцна: восенню або летам? Якое значэнне мае сонца (вада) у жыцці жывой прыроды? (Два асобныя пытанні.) **4.** Разгледзьце малюнкі на с. 7. Як гэтыя дзеці ставяцца да прыроды? Як людзі клапоцяцца аб чысціні вады ў вадаёме вашага краю? **5.** Працягвайце назіранні за зменамі ў жыцці раслін восенню: якая афарбоўка лісця ў дрэў, з якімі вы пазнаёміліся



Правообладатель Народная асвета

на экскурсіі? Паназірайце за змяненнямі афарбоўкі лісця ў бярозкі, якую вы выбралі для назірання ў.

## Асеннія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека

### Змяненні ў нежывой прыродзе восенню. Расліны ўлетку і ўвосень

*С. 8.* **1.** Разгледзьце малюнак на с. 8. Якая пара года на ім адлюстравана? Па якіх прыметах вы вызначылі, што на малюнку паказана лета? Чаму менавіта летам цвіце большая частка раслін; паспяваюць плады і насенне ў большасці раслін? (Два асобныя пытанні.) **2.** Як свеціць сонца летам? Якое яно? Якое месцазнаходжанне на небе (адносна намаляваных прадметаў) займае сонца летам? Якога колеру неба? **3.** Якая летам вада ў рэках і азёрах? Чаму летам так прыемна адпачываць каля вадаёмаў? Якія правілы трэба выконваць пры адпачынку каля вадаёмаў?

*С. 9.* **1.** Разгледзьце верхні малюнак. Якая пара года на ім адлюстравана? Параўнайце гэты малюнак з малюнкам на с. 8. Якія змяненні ў нежывой прыродзе адбываюцца восенню? Як змянілася месцазнаходжанне сонца на небе? Якія ў яго прамені восенню ў параўнанні з летам, якога колеру сонца? (*Менш яркае, чым летам*.) Якога колеру неба? Чым яно зацягнута? Якога колеру вада ў возеры? **2.** Разгледзьце малюнкі ўнізе. Успомніце летні дождж. Які ён? Чаму? Які дождж восенню ў параўнанні з летам? **3.** Паслухайце загадку:

Дом не бачны, мост на рацэ,
Быццам усё ў малацэ.
Казка гэта? Сон? Падман?
Гэта ранішні … (*туман*).

Якую яшчэ з'яву ў прыродзе можна часта назіраць восенню? Хто з вас назіраў туман? **4.** Якія змяненні ў жыцці раслін адбываюцца восенню? Разгледзьце верхні малюнак і раскажыце, як змянілася афарбоўка лісця ў бярозы, рабіны, асіны. Ці ведаеце вы, чаму восенню змяняецца афарбоўка лісця ў дрэў і кустоў? У якіх раслін восенню паспяваюць плады і насенне? (*У дуба, рабіны, клёна*.) **5.** Якіх жывёл мы не можам убачыць у прыродзе восенню? Чаму восенню знікае большасць насякомых?

### Залатая восень. Разнастайнасць асенняй афарбоўкі лісця дрэў і кустоў

*С. 10.* **1.** Разгледзьце малюнак. Якая асенняя пара на ім адлюстравана? Чаму гэты час называюць залатой восенню? Параўнайце гэты малюнак з малюнкам на с. 9. Чым адрозніваецца залатая восень ад пачатку восені? Як змянілася месцазнаходжанне сонца на небе? Як гэта паўплывала на тэмпературу паветра? **2.** Як выглядаюць расліны залатой восенню ў параўнанні з пачаткам восені? Якія фарбы ў залатой восені? У якога дрэва афарбоўка лісця найбольш разнастайная? У якіх дрэў і кустоў лісце барвовае? (*У рабіны*.) У якіх дрэў і кустоў лісце жаўцее? У якога дрэва лісты нагадваюць залатыя «манеткі»? (*У бярозы*.) Назавіце дрэвы і кусты,



Правообладатель Народная асвета

лісце ў якіх застаецца зялёным. (*Напрыклад, бэз.*) Чым табе падабаецца залатая восень? **3.** Як змяненні ў нежывой прыродзе і жыцці раслін уплываюць на жыццё жывёл?

### Расліны — частка жывой прыроды. Разнастайнасць і прыгажосць дрэў, кустоў, травяністых раслін

*С. 11.* **1.** Разгледзьце верхнія малюнкі. Па якіх прыметах вы пазналі асіну? **2.** Якім іншым словам можна назваць асіну? (*Дрэва.*) Каліну? (*Куст.*) Рамонак? (*Травяністая расліна.*) Параўнайце сцябло травяністай расліны са сцяблом дрэва і куста. Чым яны адрозніваюцца? Чым падобныя сцёблы куста і дрэва? Чым яны адрозніваюцца? **3.** Закончыце сказы: *Бяроза, асіна — гэта … . Каліна, маліна — гэта … . Званочак, рамонак — гэта … . Дрэвы, кусты, травы — гэта …* . **4.** Разгледзьце ніжнія малюнкі. Злучыце палоскамі паперы малюнкі раслін з назвай групы, да якой яны адносяцца. **5.** Што з'яўляецца ў раслін на месцы кветкі? Чаму нельга збіраць у лесе, на лузе букеты з квітнеючых раслін? Ці ёсць у вас любімая расліна? Раскажыце, чым яна вам падабаецца. Што вы можаце зрабіць, каб расліны бліжэйшага наваколля заўсёды радавалі людзей?

### Пасяванне пладоў і насення

*С. 12—13.* **1.** Разгледзьце малюнкі дрэў і кустоў на с. 12. Назавіце іх. Злучыце палоскамі паперы дрэва з яго лістамі і насеннем. **2.** Адзначце ўмоўнымі знакамі (markers) (рознымі геаметрычнымі фігурамі) расліны, якія сустракаюцца ў вашай мясцовасці. Якія яшчэ расліны растуць у вашым школьным двары (парку, скверы)? Якія ў іх плады і насенне? **3.** Разгледзьце малюнкі на с. 13. Адгадайце загадку. У якіх яшчэ раслін восенню паспяваюць плады і насенне? Хто дапамагае раслінам «рассейвацца»? Злучыце палоскамі паперы відарыс жывёлы з малюнкамі пладоў і насення, якія яна распаўсюджвае. Адзначце ўмоўным знакам расліны, насенне якіх разносіць вецер. **4.** Паназірайце за дрэвамі і кустамі бліжэйшага наваколля: якія птушкі на якіх раслінах кормяцца? Збярыце насенне травяністых раслін для падкормкі птушак зімой.

### Уплыў змяненняў у прыродзе на жыццё чалавека восенню. Як правільна апранацца восенню, загартоўваць арганізм

*С. 14.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Якія з гэтых заняткаў карысныя для здароўя? У якія гульні вы любіце гуляць? Як вы дапамагаеце дарослым у садзе або агародзе, на дачы? **2.** Вам хочацца пагуляць на свежым паветры, пабегаць, палюбавацца асенняй прыродай. Але мама з татам папрасілі вас дапамагчы ўбраць ураджай морквы на дачным участку. Як вы паступіце? Растлумачце чаму. **3.** Чаму восенню карысныя заняткі на свежым паветры? Чаму восенню неабходна загартоўваць свой арганізм? Як загартоўваецеся вы?

*С. 15.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Чым яны падобныя? Чым адрозніваюцца? Чым карысныя прагулкі ў парку, лесе восенню? Што радуе нас у парку або скверы восенню? **2.** Чым адрозніваецца адзенне дзяцей на рысунках? Чаму? Як трэба апранацца для прагулкі ранняй восенню? У дажджлівае і халоднае надвор'е? Адзначце, хто з дзяцей апрануты не ў адпаведнасці



Правообладатель Народная асвета

з надвор'ем. **3.** Паслухайце прыказкі. Як вы іх разумееце? **4.** Паслухайце тэкст. Параўнайце з тэкстам свае адказы. Раскажыце Нязнайку, чаму восенню трэба насіць цёплую непрамакальную вопратку. Што трэба рабіць, каб не прастудзіцца? **5.** Выкарыстаўшы малюнкі, пагуляйце ў гульню «Я буду — я не буду». Закончыце сказы: *Каб быць здаровым, я буду … . Каб быць здаровым, я не буду … .*

**Асеннія плады і насенне — крыніца вітамінаў**

*С. 16.* **1.** Паслухайце і адгадайце загадкі. Злучыце палоскамі паперы тэкст загадкі з малюнкам-адгадкай. **2.** Паслухайце прыказку. Як вы яе разумееце? Што вы ведаеце пра журавіны? Шыпшыну? Чым карысныя ягады гэтых раслін? Што можна з іх прыгатаваць? **3.** Разгледзьце малюнкі раслін. Адзначце, якія з пладоў Нязнайка можа сабраць у лесе восенню. Парайце Нязнайку, за якімі пладамі трэба ісці ў лес летам.

**Агародніна і садавіна. Правілы ўжывання агародніны і садавіны**

*С. 17.* **1.** Разгледзьце верхнія малюнкі. Што на іх паказана? (*Агародніна і садавіна.*) **2.** Адгадайце загадку:

Мікробаў ён збівае з ног,
Ну, а завуць яго … (*часнок*).

Што вы ведаеце аб карысных уласцівасцях часнака і цыбулі? Як вы разумееце прыказкі: «Лук ад сямі хвароб», «Часнок сем хвароб перамагае»? **3.** Дапамажыце Нязнайку раскласці агародніну і садавіну ў розныя кошыкі (пакажыце палоскамі паперы). У які кошык вы паклалі моркву? Сліву? **4.** Мама раніцай прапануе дачцэ ўзяць у школу яблык, а дзяўчынка просіць шакаладку і кажа, што яна смачнейшая. Ці правільна робіць школьніца? Што б вы ёй сказалі? Чаму трэба ўжываць агародніну і садавіну? **5.** Паслухайце верш і параўнайце з вашым адказам. **6.** Якую агародніну вырошчвае ваша сям'я на агародзе або дачы? Які ўдзел у вырошчванні агародніны прымаеце вы? Якую садавіну вырошчваюць у нашых садах? Якая садавіна паспявае восенню? **7.** Разгледзьце ніжнія малюнкі. Якія правілы гігіены трэба выконваць пры ўжыванні агародніны і садавіны? На якім малюнку дзіцё не выконвае правілы гігіены? Чаму трэба выконваць правілы гігіены пры ўжыванні агародніны і садавіны? Паслухайце другі верш. Пра якое правіла ў ім ідзе гаворка? **8.** Маша сказала, што яна ела на дачы нямытыя клубніцы і не захварэла. Можа, не абавязкова мыць садавіну і агародніну? Так і ваду можна сэканоміць. Як думаеце вы? Што б вы параілі Машы?

**Правілы асабістай гігіены. Догляд зубоў, ногцяў і валасоў**

*С. 18.* **1.** Разгледзьце верхні малюнак. Што вы можаце сказаць пра хлопчыка? **2.** Паслухайце і адгадайце загадку. Чаму вада ад хвароб зберагае? **3.** Паслухайце прыказкі. Як вы іх разумееце? **4.** Разгледзьце малюнкі аб правілах асабістай гігіены. Раскажыце, якія правілы асабістай гігіены трэба выконваць. Чаму трэба паласкаць рот пасля яды, асабліва пасля ласункаў? **5.** Як трэба клапаціцца аб чыстаце вопраткі і абутку? Што можна сказаць пра дзяцей, у якіх вопратка і абутак заўсёды чыстыя і ахайныя? **6.** Разгледзьце ніжнія малюнкі. Адзначце, якія з гэтых прадметаў у кожнага чалавека павінны быць асабістымі. **7.** Таня любіць карыстацца



Правообладатель Народная асвета

мачалкай сястры — яна ёй больш падабаецца. Ці правільна робіць Таня? Што б вы ёй параілі?

*С. 19.* **1.** Паслухайце верш, разгледзьце малюнак. У якіх выпадках трэба абавязкова мыць рукі? **2.** Паслухайце прыказку і правілы догляду зубоў. Калі трэба чысціць зубы? Чаму? **3.** Разгледзьце малюнкі, на якіх паказана, як правільна чысціць зубы. Як трэба чысціць бакавыя зубы? (*Зверху ўніз.*) Якую частку зубоў трэба чысціць потым? Якімі рухамі зубной шчоткі? (*Кругавымі.*) Якія зубы трэба чысціць у апошнюю чаргу? (*Пярэднія.*) Якімі рухамі шчоткі? (*Верхнія — рухамі зверху ўніз, ніжнія — знізу ўверх.*) **4.** Назавіце прадукты, карысныя для зубоў. Якія прадукты шкодныя для зубоў? Чаму? **5.** У Пеці здаровыя зубы. Каб яны сталі мацнейшымі, ён разгрызае арэхі. Вользе падабаецца пасля марожанага піць чай. Маша кожны дзень есць тварог. Хто з дзяцей не клапоціцца аб сваім здароўі? Чаму? З каго можна браць прыклад?

### Рэжым дня школьніка

*С. 20—21.* **1.** Паслухайце прыказку і адгадайце загадку. Назавіце тэму ўрока. **2.** Разгледзьце малюнкі. У якой паслядоўнасці трэба выконваць гэтыя дзеянні? Пранумаруйце малюнкі (з дапамогай лічбаў з касы). **3.** Якія ранішнія справы паказаны на малюнках? Чаму кожную раніцу трэба рабіць зарадку? Якія практыкаванні выконваеце вы? **4.** Чым лепш за ўсё займацца пасля школы? Адзначце ўмоўным знакам. **5.** Адзначце малюнак, дзе паказана, чым можна займацца перад сном. Чаму нельга гуляць перад сном у шумныя гульні? **6.** Разгледзьце малюнкі гадзіннікаў. Назавіце час кожнай з гэтых спраў. Параўнайце свой рэжым з рэжымам суседа па парце. **7.** Выкарыстаўшы малюнкі, пагуляйце ў гульню «Я буду — я не буду». Закончыце сказы: *Каб раніцай быць бадзёрым, я буду … / я не буду … . Каб сон быў моцны і здаровы, я буду … / я не буду … .*

### Змяненні ў нежывой прыродзе і ў жыцці раслін позняй восенню

*С. 22.* **1.** Разгледзьце малюнак. Параўнайце яго з малюнкам на с. 10. Якія змяненні ў нежывой прыродзе адбываюцца позняй восенню? Як змянілася месцазнаходжанне сонца на небе? Чаму ў канцы восені становіцца яшчэ халадней? Як выглядае неба позняй восенню? Якая з'ява вельмі часта назіраецца позняй восенню? (*Дажджы.*) Якія ападкі бываюць позняй восенню? (*Дождж з мокрым снегам.*) Чаму? **2.** Як выглядаюць дрэвы і кусты позняй восенню ў параўнанні з залатой восенню? Чаму восенню ў дрэў і кустоў ападае лісце; вянуць травяністыя расліны? (Два асобныя пытанні.)

### Дзікія і свойскія жывёлы

*С. 23.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце паказаных на іх жывёл. Адгадайце загадкі. **2.** Злучыце палоскамі паперы загадкі з малюнкамі-адгадкамі. Падрыхтуйцеся расказаць аб адной з жывёл па плане: а) дзе жыве; б) па якіх прыметах вы яе пазнаяце; в) чым пакрыта цела, якая афарбоўка шэрсці або пер'я; г) якой велічыні і афарбоўкі галава; д) якога колеру і памеру хвост; е) якой велічыні ногі і колькі іх; ж) якія гукі падае; з) чым корміцца. Чым вам падабаецца гэта жывёла? **3.** Назавіце і адзначце ўмоўнымі знакамі жывёл, якія самі клапоцяцца аб сваёй зімоўцы. Як называюць гэтых



Правообладатель Народная асвета

жывёл? Якіх яшчэ дзікіх жывёл (звяроў, насякомых, птушак і інш.) вы ведаеце? Яшчэ раз разгледзьце малюнкі і назавіце жывёл, для якіх чалавек будуе жыллё, корміць іх, а яны прыносяць яму карысць. Як называюць гэтых жывёл? Якія жывёлы ёсць у вас дома? Як вы даглядаеце іх? **4.** Назавіце адным словам: *ліса, воўк, заяц — гэта* … . Ці можна назваць адным словам жывёл: сабака, кошка, карова, мыш? Чаму?

### Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл восенню

*С. 24.* **1.** Разгледзьце малюнкі на с. 23. Па малюнку раскажыце, як рыхтуецца да зімы вавёрка; вожык. (Два асобныя пытанні.) Чаму вожык не назапашвае корм на зіму? **2.** Разгледзьце малюнкі на с. 24. Злучыце палоскамі паперы відарыс жывёлы з малюнкам яго корму. **3.** Успомніце свае назіранні на экскурсіі ў прыроду і раскажыце, якія змяненні ў жыцці насякомых адбываюцца восенню. Чаму восенню з кожным днём становіцца ўсё менш насякомых, а затым яны знікаюць? **4.** Як рыхтуюцца да зімы змеі; яшчаркі? (Два асобныя пытанні.) Паслухайце тэкст. Чаму змеі, яшчаркі хаваюцца на зіму ў зацішныя месцы? Чаму мы не бачым позняй восенню жаб і рапух?

*С. 25.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце адным словам жывёл, якія адлюстраваны злева. Пакажыце палоскамі паперы, які корм паядае кожная з намаляваных птушак. **2.** Як вы думаеце, чаму ластаўка і бусел адлятаюць у вырай, а верабей зімуе ў нас? Паслухайце тэкст. **3.** Раскажыце, па якіх прыметах вы пазнаяце ластаўку; пліску. **4.** Як называюць птушак, якія восенню адлятаюць у вырай? Назавіце некалькі пералётных птушак. Як называюць птушак, якія зімуюць у нас? Назавіце некалькі зімуючых птушак.

### Змяненні ў жыцці свойскіх жывёл восенню

*С. 26.* **1.** Разгледзьце малюнкі жывёл. Назавіце іх адным словам. Раскажыце аб адной з жывёл па плане (гл. заданне да с. 23). **2.** Якія змяненні ў жыцці свойскіх жывёл адбываюцца восенню? Чаму кароў не выганяюць на пашу? Хто корміць жывёл і даглядае іх? **3.** Яшчэ раз разгледзьце верхнія малюнкі і пакажыце палоскамі паперы, што дае чалавеку кожная з намаляваных жывёл.

### Уплыў змяненняў у нежывой прыродзе, у жыцці раслін на працу людзей восенню

*С. 27.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Успомніце свае назіранні і раскажыце, якой працай заняты людзі на палетках, у агародах і садах восенню? Якія работы выконваюць восенню ў парках і скверах? **2.** Як праца людзей залежыць ад змяненняў у прыродзе? **3.** Адзначце ўмоўнымі знакамі працу людзей, якую вы назіралі. **4.** Паслухайце прыказку. Як вы яе разумееце? Ці ведаеце вы працаўнікоў сельскай гаспадаркі, якія сталі пераможцамі ў час уборкі ўраджаю ў вашай мясцовасці (для сельскай мясцовасці)? **5.** Працягвайце назіранні за тым, як будзе змяняцца праца людзей на палетках, у скверах з надыходам зімы. Паназірайце за далейшымі змяненнямі ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін і жывёл.



Правообладатель Народная асвета

**Асеннія з’явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок)**

С. 28—29. **1.** Разгледзьце малюнкі. Якая пара года на іх адлюстравана? **2.** Пагуляйце ў гульню «Што спачатку, што потым»: пазначце лічбамі (з касы лічбаў і літар), у якой паслядоўнасці вы назіралі гэтыя з’явы ў прыродзе. **3.** Разгледзьце яшчэ раз малюнкі. Як змянялася месцазнаходжанне сонца на небе напрацягу восені? Як гэта ўплывала на тэмпературу паветра? Закончыце сказ: *Тэмпература паветра восенню паступова паніжаецца, таму што сонца* … (*з кожным днём апускаецца ніжэй*). **4.** Якія змяненні ў жыцці раслін вы назіралі восенню? Чаму восенню вяне трава, ападае лісце з дрэў і кустоў? **5.** Якія змяненні ў жыцці жывёл вы назіралі восенню? Чаму знікаюць насякомыя? Чаму адлятаюць пералётныя птушкі? Як рыхтуюцца да зімы звяры? Змеі? Жабы і рапухі? **6.** Разгледзьце ўважліва відарысы птушак. Назавіце птушак, якія восенню адлятаюць у вырай. Назавіце іх адным словам. Чаму гэтыя птушкі адлятаюць на зіму? **7.** Раскажыце, па якіх прыметах вы пазнаяце галку, шпака. Запомніце, як выглядае галка, і пастарайцеся ўбачыць яе ў прыродзе. Паназірайце, якія гукі яна падае, як перамяшчаецца, дзе шукае корм. **8.** Працягвайце назіранні за змяненнямі ў прыродзе: у нежывой прыродзе, у жыцці раслін і жывёл.

## Зімнія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека

**Змяненні ў нежывой прыродзе зімой. Як зімуюць расліны**

*С. 30—31.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Якая пара года на іх адлюстравана? Як вы пазналі, што гэта зіма? Паслухайце верш. Жураўлік адлятае ад нас восенню. Ён ніколі не бачыў зімы. Раскажыце Жураўліку, якія змяненні ў прыродзе адбываюцца зімой. Як свеціць сонейка? Як падае снег? Ці назіралі вы за першым снегам? Які ён? Ці доўга праляжаў першы снег на зямлі? Чаму? Адгадайце загадку. Разгледзьце малюнкі сняжынак. Колькі ў іх праменяў? **2.** Чым пакрыты зямля і тратуары зімой? Як трэба паводзіць сябе на вуліцы падчас галалёду і снегападу? **3.** Якія яшчэ з’явы ў нежывой прыродзе можна назіраць зімой? Адгадайце загадку:

Белыя змеі над зямлёй паляцелі.
Па дарогах папаўзлі і сугробы намялі. (*Мяцеліца.*)

Як вы здагадаліся, што загадка пра мяцеліцу? Хто з вас назіраў мяцеліцу? Як падае снег падчас мяцеліцы? Які вецер? Што гоніць вецер па зямлі? Ці добра бачна дарога падчас завірухі? Чаму ў завіруху дзецям лепш не выходзіць на вуліцу? Як можна апісаць завіруху? **4.** Што здараецца зімой з вадаёмамі? Раскажыце аб сваіх назіраннях на экскурсіі за вадаёмам (калі ёсць). Як выглядаў вадаём? Чаму нельга пераходзіць замёрзлы вадаём, катацца па ім на санках і каньках? **5.** Разгледзьце малюнак на с. 31. Як зімуюць расліны? Паслухайце тэкст. Як снег дапамагае зімой пасевам азімых?



Правообладатель Народная асвета

**Хваёвыя, ліставыя дрэвы і кусты зімой.**
**Каго корміць дрэва ўзімку. Клопат чалавека аб ахове дрэў**

*С. 32.* **1.** Разгледзьце малюнак. Якія птушкі кормяцца насеннем бярозы? (*Цецярук*.) Якія яшчэ птушкі зімой кормяцца насеннем раслін? Якім жывёлам елка дае корм і прытулак? **2.** Паслухайце тэкст. Паразважайце, што можа здарыцца, калі людзі будуць высякаць вялікую колькасць елак? **3.** Якое дрэва дапамагае сойцы пераджыць зіму? Падумайце, ці можна сойку назваць сябрам дуба? Адказ абгрунтуйце.

**Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл зімой**

*С. 33.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Як адным словам можна назваць намаляваных жывёл? **2.** Паслухайце верш. Пакажыце, выкарыстаўшы палоскі паперы, якія з птушак могуць прыляцець да кармушкі зімой. Як называюць гэтых птушак? Якіх яшчэ зімуючых птушак вы бачылі ў вашай мясцовасці? **3.** Паслухайце тэкст. Раскажыце Жураўліку, як жывецца птушкам зімой. Чаму ў гэтую пару года абавязкова трэба падкормліваць птушак? Як вы ім дапамагаеце? Які корм можна даваць птушкам? **4.** Раскажыце аб птушцы, за якой вы назіралі, па плане: а) афарбоўка галавы, спінкі, грудкі, крылаў, хваста; б) велічыня дзюбы, хваста; в) спосаб перамяшчэння; г) падаваемыя гукі. **5.** Якія птушкі прылятаюць у ваш край з надыходам першых замаразкаў? Паслухайце верш.

**Зімовы яблык**

Зямля пад снежным палатном,
і сад ад снегу белы.
Снягір красуе пад акном,
нібыта яблык спелы!

*М. Маляўка*

Паназірайце за снегірамі і сініцамі: чым яны кормяцца, як дзяўбуць корм, як паводзяць сябе ў марознае надвор'е і ў час адлігі?

*С. 34.* **1.** Адгадайце загадкі. Па якіх прыметах вы вызначылі, аб кім загадкі? Дзе жывуць гэтыя звяры? Разгледзьце верхні малюнак. Якіх жывёл можна ўбачыць у зімовым лесе? Чаму зімой у лесе нельга ўбачыць вожыка, яшчарку? Як заяц і вавёрка прыстасаваліся да жыцця ў зімовым лесе? Параўнайце афарбоўку шэрсці ў вавёркі ў пачатку восені (с. 23) і зімой. **2.** Як зімой жывецца ласю; лісе? (Два асобныя пытанні.) Па якіх прыметах вы пазнаяце лася? Як змяняецца знешні выгляд лася ў сярэдзіне зімы? (*Скідвае рогі.*) Як зімуе мядзведзь? Чаму мядзведзь на зіму засынае, а вавёрка, заяц, воўк і зімой вядуць актыўны спосаб жыцця? **3.** Як зімуюць змеі; жабы; насякомыя? (Тры асобныя пытанні.) Чаму гэтыя жывёлы на зіму хаваюцца ў зацішныя месцы і дранцвеюць? Як чалавек можа дапамагчы дзікім жывёлам зімой?

*С. 35.* **1.** Паслухайце народную прымету. Праверце яе. **2.** Разгледзьце сляды жывёл пад малюнкамі. У «кнізе зімы» кожны жыхар «падпісваецца» сваімі знакамі. **3.** Паглядзіце на сляды ў прамавугольніку. «Прачытайце», хто прайшоў. Чым адрозніваюцца сляды вароны ад слядоў вераб'я? Чаму?



Правообладатель Народная асвета

Успомніце, як перамяшчаюцца верабей і варона. **4.** Рашыце лагічную задачу: «У садзе на снезе былі бачны сляды нейкай жывёлы. Па гэтых слядах мы падышлі да яблыні. Кара ў дрэва была аб’едзена. Чые сляды былі на снезе?» Чаму вы так думаеце? **5.** Паслухайце (або прачытайце) тэкст. Чаму сляды зайца неаднолькавыя па велічыні? Паназірайце і пастарайцеся «прачытаць» па слядах, якія жывёлы прыходзілі ў ваш двор, сад (для сельскай мясцовасці).

### Свойскія жывёлы зімой

*С. 36—37.* **1.** Адгадайце загадкі. Разгледзьце малюнкі. Злучыце палоскамі паперы загадкі з малюнкамі-адгадкамі. Назавіце свойскіх жывёл. **2.** Як змяняецца жыццё свойскіх жывёл зімой? Чаму? Па малюнках раскажыце, як людзі даглядаюць свойскіх жывёл. Паслухайце (або прачытайце) тэкст. **3.** Калі ў вас ёсць свойская жывёла, падрыхтуйцеся аб ёй расказаць. **4.** Чым адрозніваецца жыццё свойскіх жывёл ад жыцця дзікіх жывёл зімой? **5.** Чаму трэба з павагай адносіцца да працы сельскіх жыхароў?

### Змяненні ў працы людзей зімой

*С. 38—39.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Паслухайце (або прачытайце) тэкст. Адзначце ўмоўнымі знакамі працу людзей зімой, якую вы назіралі. Што робяць людзі зімой на палетках? Навошта на палеткі вывозяць гной? **2.** Што робяць зімой у механічных майстэрнях? Чаму сельскагаспадарчыя машыны рамантуюць зімой? **3.** Якой яшчэ працай людзі займаюцца ў гэтую пару года? **4.** Чаму вуліцы трэба ачышчаць ад снегу і пасыпаць пяском? Чаму зімой трэба быць асабліва асцярожным пры пераходзе вуліц? Чаму нельга катацца на санках паблізу ад вуліц, дзе ходзіць транспарт? **5.** Разгледзь малюнак, дзе паказана праца людзей у цяпліцы. Чаму трэба старацца ўжываць як мага больш агародніны?

### Клопат чалавека аб сваім здароўі зімой. Як правільна апранацца

*С. 40.* **1.** Паслухайце прыказку. Як вы яе разумееце? **2.** Разгледзьце малюнкі. Якія зімнія заняткі карысны для здароўя? Чаму? Разгледзьце, як апрануты дзеці на малюнках. Хто з дзяцей апрануты правільна? Якой павінна быць вопратка для рухавых зімніх гульняў? Для прагулак? Хто з дзяцей апрануты няправільна? Чаму? **3.** Паслухайце і адгадайце загадкі. Па якіх прыметах вы здагадаліся, аб чым ідзе гаворка? **4.** Паслухайце (або прачытайце) тэкст. Якія правілы трэба выконваць падчас гульні ў хакей, катання на каньках, на санках? У якое надвор’е нельга гуляць? Якія правілы трэба выконваць для таго, каб зімой не прастудзіцца? **5.** Ваня катаўся з горкі на санках. Ён шмат разоў падняўся на горку, стаміўся і спацеў. Каб адпачыць, ён лёг на снег. Ці правільна зрабіў Ваня? Як вы думаеце, чаму Ваня стаміўся і спацеў?

### Як правільна загартоўваць арганізм зімой

*С. 41.* **1.** Паслухайце (або прачытайце) прыказку. Растлумачце, як вы яе разумееце. **2.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, што трэба ра-



Правообладатель Народная асвета

біць для таго, каб загартаваць свой арганізм. Адзначце заняткі, якія садзейнічаюць загартоўванню арганізма. **3.** Паслухайце карысныя парады. Для чаго патрэбны загартовачныя працэдуры? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце. Раскажыце, якія з загартовачных працэдур выконваеце вы. **4.** Якіх правілаў трэба прытрымлівацца, калі вы ўсё ж захварэлі? **5.** Саша абліваецца раніцай халоднай вадой, але робіць гэта нерэгулярна. Оля з мамай гуляюць на свежым паветры ў любое надвор'е. Коля рэгулярна наведвае басейн. Хто з дзяцей робіць правільна? Адказ абгрунтуйце.

### Зімнія з'явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок)

*С. 42—43.* **1.** Разгледзьце малюнак на с. 42. Якая пара года на ім адлюстравана? Як вы гэта вызначылі? Успомніце свае назіранні ў прыродзе зімой і знайдзіце памылкі мастака. Якіх жывёл нельга ўбачыць у прыродзе зімой? Чаму? **2.** Раскажыце Жураўліку, якія змяненні ў нежывой прыродзе адбываюцца зімой. Чаму зімой холадна? **3.** Як расліны прыстасаваліся да змяненняў у нежывой прыродзе? Чым час ад часу пакрыты галінкі дрэў зімой? (*Снегам, інеем.*) Чаму зімой дрэвы і кусты спыняюць свой рост і развіццё? **4.** Раскажыце Жураўліку, як змяняецца жыццё насякомых; птушак; звяроў. (Тры асобныя пытанні.) Чаму дзяцел на зіму не адлятае ў вырай? Якіх яшчэ птушак можна ўбачыць зімой? Як называюць птушак, якія не адлятаюць на зіму ў вырай? Раскажыце аб сваіх назіраннях за зімуючымі птушкамі. Чым увесь дзень заняты сініцы, галкі, вераб'і, вароны? Як вы дапамагалі птушкам перажыць зімнюю бяскорміцу? **5.** Разгледзьце малюнкі на с. 43. Як жывецца ласям, зубрам? Чым чалавек можа дапамагчы дзікім жывёлам? Запомніце, што ў пачатку вясны птушкам і звярам, як і зімой, патрэбна дапамога чалавека. Сачыце за тым, каб у вашых кармушках для птушак заўсёды быў корм. **6.** Падрыхтуйцеся разам з суседам па парце расказаць Жураўліку, як розныя жывёлы прыстасоўваюцца да зімовых халадоў, недахопу корму.

## Вясеннія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека

### Ранняя вясна. Сакавік — першы месяц вясны

*С. 44.* **1.** Разгледзьце малюнак. Якая пара года на ім адлюстравана? Чаму вы так вырашылі? Як змянілася месцазнаходжанне сонца на небе вясной у параўнанні з зімой? Як змянілася тэмпература паветра? Чаму? Як змяніўся колер неба? **2.** Паслухайце загадку:

Вясною плачуць ледзяшы
Ды звонка звоняць … (*капяжы*).

Хто з вас назіраў капеж? У які час сутак можна назіраць капеж з дахаў? Як утвараюцца ледзяшы? Калі яны з'яўляюцца? Дзе іх можна ўбачыць? Чым небяспечны ледзяшы? Якія правілы трэба выконваць, каб пазбегнуць небяспекі пры падзенні ледзяшоў? Паслухайце (або прачытайце) тэкст. Назавіце прыметы вясны.



Правообладатель Народная асвета

**Асцярожна — крыгаход! Вясенні разліў рэк (паводка). Правілы паводзін каля вадаёмаў вясной**

*С. 45.* **1.** Разгледзьце верхні малюнак. Як змяніўся вадаём? Чаму растае лёд? Чаму нельга гуляць на лёдзе зімой у адлігу і вясной? Як трэба паводзіць сябе пры назіраннях за крыгаходам? **2.** Разгледзьце ніжні малюнак. Што на ім паказана? (*Паводка*.) Ці назіралі вы яе? Калі? Дзе? Ці разліваецца рака ў вашай мясцовасці (калі ёсць)? Якую шкоду паводка прыносіць людзям? **3.** Разам з суседам па парце падрыхтуйцеся расказаць аб правілах паводзін падчас крыгаходу. Якія правілы трэба выконваць падчас паводкі?

**Вясна — час абуджэння раслін. Раннеквітнеючыя расліны — корм для насякомых**

*С. 46.* **1.** Разгледзьце малюнак. Якая пара года на ім адлюстравана? Як вы здагадаліся, што на малюнку паказана ранняя вясна? Успомніце свае назіранні і па малюнках раскажыце, як змяненні ў нежывой прыродзе ўплываюць на жыццё раслін. У якіх дрэў набраклі пупышкі? Чаму вясной абуджаюцца дрэвы і кусты? **2.** Разгледзьце ляшчыну і раскажыце, як выглядае гэты куст. У якіх яшчэ раслін ранняй вясной з'яўляюцца каташкі? **3.** Якія травяністыя расліны зацвітаюць ранняй вясной першымі? **4.** Прачытайце тэкст. Хто корміцца нектарам раннеквітнеючых раслін?

**Беражлівыя адносіны да першацветаў**

*С. 47.* **1.** Уважліва разгледзьце відарысы раслін. Па якіх прыметах вы пазнаяце ў прыродзе падбел? **2.** Паслухайце верш. Што ў ім гаворыцца пра пралеску? Як вы думаеце, чаму пралесцы стала «страшна»? **3.** Якія з раннеквітнеючых раслін вы бачылі ў прыродзе? Чаму трэба беражліва адносіцца да раннеквітнеючых раслін?

**Выкарыстанне жыватворнай сілы прыроды вясной. Прагулкі і гульні ў парку, скверы**

*С. 48.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Чым можна займацца вясной на свежым паветры? Што вы дадалі б да гэтых заняткаў? **2.** Чым можна дапамагчы бацькам вясной на дачы або прысядзібным участку? Чым карысны прагулкі і праца на свежым паветры вясной? Чым вам падабаецца вясна? **3.** Адзначце занятак, небяспечны для жыцця. Чаму нельга гуляць у хакей, катацца на каньках вясной на вадаёмах? Разгледзьце, як апрануты дзеці. Ці правільна апрануты дзеці на гэтым малюнку? **4.** На якім малюнку паказана позняя вясна? Ці правільна апрануты дзеці на гэтым малюнку? Зрабіце вывад, як правільна апранацца вясной. Растлумачце, чаму трэба апранаць менавіта такую вопратку. **5.** Прачытайце карысныя парады. Якія з гэтых парад выконваеце вы? Чаму ранняй вясной трэба апранаць цёплыя і непрамакальныя адзенне і абутак? Што можа здарыцца, калі гуляць з мокрымі нагамі? Чаму так важна вясной ужываць многа зеляніны? Якую зеляніну ўжываеце вы?



Правообладатель Народная асвета

**Бяспечныя месцы для гульняў**

*С. 49.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Адзначце зялёным кружком, дзе можна гуляць, а чырвоным — дзе нельга. **2.** Дзе гуляеце вы? Дакажыце, што гэта бяспечнае месца для гульняў і прагулак. Чаму небяспечна гуляць на дарозе або побач з ёй? Чаму нельга гуляць каля бакаў са смеццем? На развалінах? Паблізу ад катлавана? **3.** Раскажыце Нязнайку аб тым, дзе гуляць найбольш бяспечна. Прачытайце параду. Растлумачце, чаму важна ўмець правільна выбіраць месца для гульняў. **4.** Выкарыстаўшы малюнкі, пагуляйце ў гульню «Я буду — я не буду». Закончыце сказы: *Каб не падвяргаць сябе небяспецы, я буду гуляць … . Каб не падвяргаць сябе небяспецы, я не буду гуляць … .*

**Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл вясной. Прылёт птушак**

*С. 50.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Якія птушкі на іх паказаны? Раскажыце аб сваіх назіраннях за паводзінамі птушак вясной. **2.** Успомніце, чым кормяцца птушкі. Якія змяненні адбыліся ў жыцці раслін; насякомых? (Два асобныя пытанні.) Чаму птушкі вясной вяртаюцца ў родныя мясціны? **3.** Прачытайце тэкст. Лічбамі 1, 2, 3 (з касы лічбаў і літар) адзначце на малюнках, у якім парадку прылятаюць намаляваныя птушкі. Чым кормяцца жаўрукі і шпакі? Чаму яны вяртаюцца раней за іншых птушак? **4.** З якой прыроднай з'явай звязаны прылёт ластавак? Паназірайце за іх паводзінамі. Як вы разумееце прыказку: «Жаўрук прылятае на праталінку, журавель — з цяплом, а ластаўка — з лістом»?

**Гнездаванне птушак**

*С. 51.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Чым заняты птушкі? Раскажыце Нязнайку, дзе будуе сваё гняздо грак; жаўрук. (Два асобныя пытанні.) З чаго птушкі будуюць свае гнёзды? Як трэба адносіцца да птушак у гэты перыяд? Як вы думаеце, чаму вясной у лесе нельга гуляць з сабакамі, шумець? **2.** Паслухайце верш. Што б вы адказалі птушкам? **3.** Разгледзьце яшчэ раз малюнкі. Складзіце апавяданне «Вясеннія клопаты птушак». Для апавядання выкарыстайце словы: *будуюць, адкладваюць, наседжваюць, выводзяць.*

**Змяненні ў жыцці насякомых і іншых жывёл вясной**

*С. 52.* **1.** Адгадайце загадкі. Злучыце палоскамі паперы загадкі з малюнкамі-адгадкамі. **2.** Чаму вясной абуджаюцца насякомыя? Раскажыце аб сваіх назіраннях за паводзінамі насякомых вясной. Якія матылі з'яўляюцца першымі? (*Лімонніца, крапіўнік.*) Як вы думаеце чаму? (*Зімуюць у дарослым стане.*) **3.** Чаму божых каровак, мурашак называюць ахоўнікамі раслін? **4.** Паслухайце (або прачытайце) тэкст. Як трэба адносіцца да рапух? Чаму пра рапуху і жабу гавораць, што яны безабаронныя жывёлы? **5.** Падрыхтуйцеся расказаць аб змяненнях у жыцці адной з гэтых жывёл вясной. **6.** Паназірайце за насякомымі ў прыродзе: чым яны кормяцца? Як ратуюцца ў час небяспекі?

**Змяненні ў жыцці дзікіх звяроў вясной**

*С. 53.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Якія жывёлы на іх адлюстраваны? Прачытайце тэкст пра вожыкаў. Як вожычыха-маці клапоціцца аб сваіх



Правообладатель Народная асвета

дзіцянятах? **2.** Па якіх прыметах вы пазнаяце барсука? Прачытайце тэкст пра барсукоў. Чаму барсучыху можна назваць клапатлівай маці? **3.** Чаму нельга падбіраць у лесе і прыносіць дадому дзіцянят дзікіх звяроў?

**Змяненні ў жыцці свойскіх жывёл вясной**

*С. 54—55.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце загадкі. Злучыце палоскамі паперы загадкі з малюнкамі-адгадкамі. Ці можна назваць адным словам намаляваных тут жывёл? Якія змяненні ў жыцці свойскіх жывёл адбываюцца вясной? **2.** Падрыхтуйцеся расказаць аб сваіх назіраннях за свойскімі жывёламі. Назавіце дзіцянят свойскіх жывёл, якіх вы бачылі. Назавіце дзіцянят намаляваных тут жывёл. Праверце сябе: прачытайце гэтыя назвы. Прачытайце тэкст. **3.** Як людзі даглядаюць свойскіх жывёл вясной? Як вы дапамагаеце дарослым (для сельскай мясцовасці)? **4.** Летам паназірайце (пры магчымасці) за жарабятамі, ягнятамі, парасятамі, куранятамі, іншымі свойскімі жывёламі: як яны рухаюцца, чым кормяцца, якія падаюць гукі і да т. п.?

**Праца людзей вясной**

*С. 56—57.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Успомніце свае назіранні і раскажыце, якія работы выконваюць людзі вясной на палетках. Чаму менавіта вясной высяваюць насенне ў глебу? **2.** Якія работы выконваюць людзі ў садах і парках; на вуліцах гарадоў і сёл? (Два асобныя пытанні.) Назавіце работы, якія вы назіралі. **3.** Прачытайце прыказку. Як вы яе разумееце?

**Уплыў людзей на жыццё раслін і жывёл. Неабходнасць аховы раслін, жывёл роднага краю**

*С. 58—59.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце сказы пад малюнкамі. Падрыхтуйцеся расказаць, якія правілы паводзін трэба выконваць, каб вы маглі сказаць пра сябе: «Я — сябар і абаронца прыроды». **2.** На малюнках адзначце дзяцей, якіх нельга назваць сябрамі прыроды. Падрыхтуйцеся растлумачыць, чаму вы так думаеце. **3.** Адзначце правілы сяброў прыроды, якія вы выконваеце. Падрыхтуйцеся расказаць, якіх яшчэ правілаў па ахове прыроды трэба прытрымлівацца.

**Вясеннія з'явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок)**

*С. 60.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Успомніце свае назіранні за змяненнямі ў прыродзе вясной. Абазначце лічбамі (з касы лічбаў і літар), у якой паслядоўнасці вы назіралі адлюстраваныя з'явы ў прыродзе (што спачатку, што потым). **2.** Па малюнках раскажыце, якія змяненні ў нежывой прыродзе адбываюцца ранняй вясной; у сярэдзіне вясны; позняй вясной. (Тры асобныя пытанні.) Які самы халодны месяц вясны? Самы цёплы? Чаму? **3.** Чаму вясной у дрэў набракаюць пупышкі; з'яўляюцца лісты; зелянее трава? (Тры асобныя пытанні.)

*С. 61.* **1.** Разгледзьце малюнак. Як выглядае луг у канцы вясны? **2.** Якія змяненні ў жыцці жывёл адбываюцца вясной? **3.** Як трэба адносіцца да яшчарак, жаб, каляровых матылёў? Чаму вясной да птушак трэба ставіцца асабліва беражліва? Паслухайце верш. Чаму нельга на лугах, у лесе збіраць букеты з квітнеючых раслін? **4.** Закончыце сказы: *Сонца вясной падымаецца*



Правообладатель Народная асвета

*вышэй, таму становіцца … . Становіцца цяплей, таму набракаюць пупышкі, зацвітаюць … . Зацвітаюць раннеквітнеючыя расліны, таму … . З'яўляюцца насякомыя, прылятаюць … .*

## Змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека летам

### Змяненні ў нежывой прыродзе летам. Летнія навальніцы

*С. 62—63.* **1.** Разгледзьце малюнкі на с. 62—63. Якая пара года на іх адлюстравана? Па якіх прыметах вы гэта вызначылі? **2.** Прачытайце верш пра сонца. Як летам свеціць сонца? Як пра гэта сказана ў вершы? Падбярыце словы, якія паказваюць, якое сонейка летам. **3.** Якое неба летам? Якая вада ў возеры? Што блішчыць на лістах раслін? (*Раса*.) У які час летам можна ўбачыць расу? Чаму днём раса знікае? **4.** Адгадайце загадку. Разгледзьце ніжні малюнак на с. 63. Якая з'ява ў нежывой прыродзе паказана на гэтым малюнку? Ці назіралі вы навальніцу? Як выглядае неба падчас навальніцы? Якія правілы трэба выконваць падчас навальніцы? Чаму нельга хавацца ад дажджу ў час навальніцы пад асобна стаячым дрэвам? Якія кроплі ў летняга дажджу? **5.** Якія яшчэ з'явы могуць суправаджаць навальніцу?

*С. 64.* **1.** Адгадайце загадку. Разгледзьце малюнак. Што на ім паказана? Назавіце колеры вясёлкі. Хто з вас назіраў вясёлку? Раскажыце аб сваіх уражаннях. **2.** Прачытайце тэкст. Якія з'явы ў нежывой прыродзе адбываюцца летам?

### Расліны летам: цвіценне траў, паспяванне ягад

*С. 65.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, якія расліны цвітуць летам. Якія яшчэ квітнеючыя расліны вы бачылі на школьным двары (у двары дзіцячага сада), на лузе, у лесе, у полі? Чаму летам многа квітнеючых раслін? **2.** У якіх раслін летам паспяваюць ягады? У якіх раслін саду, агарода летам паспяваюць плады? Прачытайце тэкст. Чаму чэрвень называюць месяцам кветак?

### Ядавітыя расліны

*С. 66.* Разгледзьце малюнкі. Прачытайце загадку. Злучыце палоскай паперы загадку з малюнкам-адгадкай. Якія яшчэ ядавітыя расліны вы ведаеце? Па якіх прыметах вы пазнаяце воўчае лыка? Прачытайце тэкст. Чаму нельга рваць і нават дакранацца да ядавітых раслін?

### Жыццё свойскіх жывёл летам

*С. 67.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Хто паказаны на першым (другім, трэцім) малюнку? Як адным словам назваць намаляваных жывёл? **2.** Як змяняецца жыццё свойскіх жывёл летам у параўнанні з зімой і ранняй вясной? **3.** Як свойскія жывёлы клапоцяцца аб сваіх дзіцянятах? Раскажыце пра свае назіранні за жыццём свойскіх жывёл. **4.** Летам паназірайце за свойскімі жывёламі: дзе яны праводзяць больш часу, чым кормяцца, як клапоцяцца аб сваіх дзіцянятах?



Правообладатель Народная асвета

**Жыццё дзікіх жывёл летам, іх клопат пра патомства**

*С. 68—69.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце тэксты пад малюнкамі. Раскажыце аб сваіх назіраннях за дзіцянятамі жывёл. Чаму жывёл называюць «клапатлівымі бацькамі»? Што яшчэ вы ведаеце аб тым, як жывёлы клапоцяцца аб сваіх дзіцянятах? **2.** Адзначце відарысы жывёл, якіх вы бачылі.

**Ахова здароўя чалавека летам. Небяспечныя сітуацыі летам пры сустрэчы з ядавітымі раслінамі, са змеямі**

*С. 70—71.* **1.** Чым вам падабаецца лета? Разгледзьце верхні малюнак на с. 70. Што робяць дзеці? Які месяц лета адлюстраваны на малюнку? Чаму вы так вырашылі? Якія ягады збіраюць дзеці? Што вы ведаеце пра карысныя ўласцівасці чарніц; суніц? (Два асобныя пытанні.) **2.** Раскажыце, як можна ўмацоўваць здароўе летам. Чым карысныя прагулкі ў лес, на луг, у парк? **3.** Разгледзьце малюнкі раслін на с. 70 (унізе) і с. 71 (уверсе). Знакам «+» (з касы лічбаў і літар) пазначце, якія карысныя для здароўя ягады Нязнайка можа сабраць у кошык. **4.** Прачытайце тэкст. Назавіце ядавітыя расліны, якія можна сустрэць у лесе. Праверце, ці правільна вы выканалі папярэдняе заданне: ці ядомыя ягады сабраў Нязнайка з вашай дапамогай? **5.** Разгледзьце яшчэ раз малюнкі ядавітых раслін. Вызначыце, якім раслінам належаць гэтыя прыметы: ягады чырвоныя, нібы прыклееныя да сцябла; чырвоныя ягады вісяць на сцябле паміж двума лістамі. **6.** Разгледзьце малюнкі ўнізе на с. 71. Раскажыце, якія небяспечныя сітуацыі могуць здарыцца ў лесе, на лузе летам. Як трэба апранацца, каб пазбегнуць укусаў кляшчоў і іншых насякомых? Як трэба сябе паводзіць, каб пазбегнуць укусу гадзюкі? **7.** Разгледзьце малюнак казяльца ядавітага. Запомніце гэтую расліну. Калі сустрэнеце яе ў прыродзе, ніколі не рвіце. Казялец — ядавітая расліна. **8.** Выкарыстаўшы малюнкі, пагуляйце ў гульню «Я буду — я не буду». Закончыце сказы: *Каб пазбегнуць небяспекі, я буду … . Каб пазбегнуць небяспекі, я не буду … .*

**Летняе загартоўванне арганізма. Правілы паводзін каля вадаёмаў і ў вадзе. Загар**

*С. 72.* **1.** Разгледзьце малюнак. Што робяць дарослыя і дзеці? Ці правільна сябе паводзяць дзеці? Чаму дзяўчынка выціраецца пасля купання? Чаму прыемна і карысна адпачываць летам на беразе вадаёма? **2.** Прачытайце прыказку. Чаму яна асабліва прыдатная для лета?

*С. 73.* **1.** Паслухайце верш. Пра што ён? Чаму дзецям так прыемна летам на рацэ? **2.** Чым карысныя летняе купанне і загар? **3.** Якія правілы неабходна выконваць пры купанні? **4.** Разгледзьце малюнак. Якія правілы парушылі дзеці? **5.** Чаму нельга купацца ў незнаёмых вадаёмах або ў забароненых месцах? Чаму дзецям трэба купацца з дарослымі? Чаму нельга забаўляцца падчас купання? **6.** Прачытайце карысныя парады. З якімі яшчэ правіламі вы пазнаёміліся ў тэксце? **7.** Вы загараеце ўжо больш за 20 мінут. Мама просіць вас апрануцца і пасядзець у цені. Але вам не хочацца — так прыемна ляжаць пад цёплымі прамянямі сонейка. Што б вы зрабілі? Чаму?



Правообладатель Народная асвета

**Змяненні ў прыродзе і працы людзей у розныя поры года (абагульняючы ўрок)**

*С. 74—75.* **1.** Прачытайце першы верш на с. 74. Пра якую пару года ў ім гаворыцца? Злучыце палоскамі паперы верш і малюнкі, на якіх паказаны змяненні ў прыродзе і працы людзей восенню. Успомніце, якія яшчэ змяненні ў працы людзей адбываюцца восенню. **2.** Прачытайце другі верш. Пра якую пару года ў ім гаворыцца? Злучыце палоскай паперы верш і малюнак, на якім паказаны змяненні ў прыродзе зімой. Успомніце, якія яшчэ змяненні ў прыродзе і працы людзей адбываюцца зімой. **3.** Прачытайце трэці верш. Пра якую пару года ў ім гаворыцца? Злучыце палоскамі паперы верш і малюнкі, на якіх паказаны змяненні ў прыродзе вясной. Успомніце, якія яшчэ змяненні ў прыродзе і працы людзей адбываюцца вясной. **4.** Прачытайце першы верш на с. 75. Пра якую пару года ў ім гаворыцца? Злучыце палоскамі паперы верш і малюнкі, на якіх паказаны змяненні ў прыродзе летам. **5.** Падрыхтуйцеся расказаць, якая пара года вам падабаецца больш за ўсё. Чаму? Па магчымасці паназірайце летам за цвіценнем траў, кустоў і дрэў, за паводзінамі дзікіх і свойскіх жывёл, з якімі вы знаёміліся на працягу года. Вывучыце верш «Запомніце, дзеткі…» на памяць.

## Чалавек і грамадства

**Мой горад (мая вёска)**

*С. 76—77.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Дайце назву кожнаму з іх. Па якіх прыметах вы вызначылі, што на першым малюнку адлюстраваны горад; на другім — вёска? (Два асобныя пытанні.) **2.** У якім населеным пункце жывяце вы? Як называецца ваш горад (ваша вёска)? **3.** Успомніце свае назіранні на экскурсіі і раскажыце, якія ёсць у вашым горадзе (у вашай вёсцы): а) заводы, жывёлагадоўчыя фермы, рамонтныя майстэрні і да т. п.; б) спартыўныя збудаванні, бібліятэкі, кінатэатры, паркі і г. д.; в) помнікі, памятныя месцы, іншыя славутыя мясціны. **4.** Які транспарт ёсць у вашым горадзе (якім відам транспарту вы дабіраецеся да бліжэйшага горада)? **5.** Чым вам падабаецца ваш горад (ваша вёска)? Што вы можаце зрабіць для таго, каб ваш горад (ваша вёска) стаў (стала) яшчэ прыгажэйшым?

**Правілы дарожнага руху**

*С. 78.* **1.** Разгледзьце малюнкі дарожных знакаў. Якія з гэтых знакаў вы бачылі на вуліцах свайго населенага пункта? Чаму трэба пераходзіць вуліцу толькі па пешаходным пераходзе? **2.** Разгледзьце малюнак унізе. Што на ім паказана? Чым дарога па-за населеным пунктам адрозніваецца ад вуліцы ў вялікім горадзе? Якое правіла выконваюць пешаходы пры руху па дарозе па-за населеным пунктам? Чаму пешаходы ідуць насустрач транспарту, які рухаецца? **3.** Якія Правілы дарожнага руху вы выконваеце? Чаму іх трэба ведаць і выконваць? **4.** Прачытайце тэкст. Чаму на дарозе па-за населеным пунктам пешаходы павінны ісці насустрач транспарту, які рухаецца?



Правообладатель Народная асвета

### Правілы пераходу вуліцы. Святлафор

*С. 79.* **1.** Адгадайце загадку. Якія святлафоры змяшчаюць зараз на асабліва ажыўленых участках дарог горада? **2.** Паслухайце верш. Пра што ў ім ідзе гаворка? Раскажыце, што абазначаюць сігналы святлафора. Што можа здарыцца, калі не выконваць правілы пераходу вуліцы? **3.** Разгледзьце малюнкі ўнізе. Чаму на першым малюнку пешаходы стаяць? Ці выконваюць пешаходы Правілы дарожнага руху на другім малюнку? **4.** Падумайце, чым небяспечны пераход вуліцы ўзімку. Як трэба пераходзіць вуліцу падчас галалёду і снегападу? **5.** Раскажыце Нязнайку, якія Правілы дарожнага руху трэба ведаць кожнаму пешаходу. **6.** Хлопчыкам трэба перайсці дарогу, але пераход знаходзіцца на адлегласці. Пеця прапануе, пакуль не бачна машын, перабегчы дарогу. Коля задумаўся… Як вы думаеце, што адкажа Коля?

### Я і мая сям'я. Значэнне сям'і ў жыцці чалавека

*С. 80.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, што на іх паказана. Назавіце адным словам усіх намаляваных людзей. Назавіце кожнага члена сям'і, паказанай на малюнку. Чым заняты кожны з іх? **2.** Раскажыце пра сваю сям'ю. Як завуць маму, тату, бабулю, дзядулю? Дзе працуюць бацькі? Як яны клапоцяцца пра вас?

### Правы і абавязкі дзяцей і бацькоў. Добразычлівыя адносіны ў сям'і

*С. 81.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, як бацькі клапоцяцца пра сваіх дзяцей. Як дзеці дапамагаюць сваім бацькам? **2.** Якія абавязкі ў кожнага з вас у сям'і? Чым вы радуеце сваіх бацькоў? Чым вы засмучаеце іх? **3.** У дарослых і дзяцей у сям'і розныя абавязкі. А якія абавязкі агульныя? (*Любіць, паважаць, не крыўдзіць адзін аднаго, клапаціцца адзін аб другім і да т. п.*) **4.** Паслухайце верш. Як мамы клапоцяцца пра сваіх дзяцей? Чым вы можаце парадаваць сваіх бацькоў? Чым вы радуеце сваіх бабуль і дзядуль? **5.** Раскажыце, якія ласкавыя, прыемныя словы вы маглі б сказаць сваім бацькам; бабулі і дзядулю. (Два асобныя пытанні.) **6.** Прачытайце тэкст. Раскажыце, як трэба адносіцца адзін да аднаго ў сям'і. **7.** Паслухайце верш.

**Свая дапамога**

У нашай хаце пацямнела,
Сонейка не бачу я:
Нечакана захварэла
Мамачка мая.

У яе тэмпература,
Цяжка мамачцы маёй.
І таблеткі, і мікстуру
Я прыношу ёй.

Я памыю сам пасуду
І вазоны ўсе палью.
Берагчы заўсёды буду
Мамачку маю.

У нашай хаце пасвятлела,
Сонейка зазззяла ў ёй:
Палягчэла, палягчэла
Мамачцы маёй! *В. Жуковіч*

Ці спадабаўся вам хлопчык, аб якім расказваецца ў вершы? Чаму?



Правообладатель Народная асвета

**Небяспечныя сітуацыі дома**

*С. 82.* **1.** Разгледзьце верхнія малюнкі. Раскажыце Нязнайку, якія небяспечныя прадметы знаходзяцца ў кватэры. Растлумачце, чым яны небяспечныя. **2.** Разгледзьце ніжнія малюнкі. Раскажыце, якія правілы трэба выконваць, каб пазбегнуць небяспекі. Якія з гэтых правілаў выконваеце вы? Як правільна выключаць прас? Што можа здарыцца, калі цягнуць за шнур пры выключэнні праса? Што можа здарыцца з хлопчыкам, які хоча ўзяць голымі рукамі гарачую накрыўку? Як правільна адкрываць гарачую каструлю? Чаму трэба асцярожна праходзіць міма, калі на пліце стаіць коўшык з гарачай вадой або патэльня? Як трэба правільна ставіць коўшык, патэльню на пліту? **3.** Прачытайце верш. Якую карысную параду ў ім даюць? Ці прытрымліваецеся вы гэтай парады?

**Сігналы трывогі**

*С. 83.* **1.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, якія небяспечныя сітуацыі могуць паграavailable чалавеку дома. Па якім нумары трэба тэлефанаваць пры пажары? Куды трэба тэлефанаваць, калі нехта чужы спрабуе адчыніць або ўзламаць дзверы? Па якім нумары? Куды трэба тэлефанаваць, калі хтосьці захварэў? Па якім нумары? Па якім нумары трэба тэлефанаваць пры ўцечцы газу? Як вызначыць, што ў кватэры ўцечка газу? **2.** Прачытайце тэкст. Што трэба гаварыць дзяжурнаму падчас званка? **3.** Запомніце нумары, па якіх трэба тэлефанаваць пры небяспецы. Чаму нельга набіраць гэтыя нумары без неабходнасці?

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## ЗМЕСТ

### Уводзіны


Наша Радзіма — Беларусь . . . 3
Наша Радзіма — край блакітных рэк, азёр і лясоў . . . 4


### Прырода і чалавек


Што такое прырода. Жывая і нежывая прырода . . . 6


### Асеннія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека


Змяненні ў нежывой прыродзе восенню. Расліны ўлетку і ўвосень . . . 8
Залатая восень. Разнастайнасць асенняй афарбоўкі лісця дрэў і кустоў 10
Расліны — частка жывой прыроды. Разнастайнасць і прыгажосць дрэў, кустоў, травяністых раслін . . . 11
Пасяванне пладоў і насення . . . 12
Уплыў змяненняў у прыродзе на жыццё чалавека восенню. Як правільна апранацца восенню, загартоўваць арганізм . . . 14
Асеннія плады і насенне — крыніца вітамінаў . . . 16
Агароднiна і садавіна. Правілы ўжывання агародніны і садавіны . . . 17
Правілы асабістай гігіены. Догляд зубоў, ногцяў і валасоў . . . 18
Рэжым дня школьніка . . . 20
Змяненні ў нежывой прыродзе і ў жыцці раслін позняй восенню . . . 22
Дзікія і свойскія жывёлы . . . 23
Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл восенню . . . 24
Змяненні ў жыцці свойскіх жывёл восенню . . . 26
Уплыў змяненняў у нежывой прыродзе, у жыцці раслін на працу людзей восенню . . . 27
Асеннія з’явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок) . . . 28


### Зімнія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека


Змяненні ў нежывой прыродзе зімой . . . 30
Як зімуюць расліны . . . 31
Хваёвыя, ліставыя дрэвы і кусты зімой. Каго корміць дрэва ўзімку. Клопат чалавека аб ахове дрэў . . . 32
Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл зімой . . . 33
Свойскія жывёлы зімой . . . 36
Змяненні ў працы людзей зімой . . . 38
Клопат чалавека аб сваім здароўі зімой. Як правільна апранацца . . . 40
Як правільна загартоўваць арганізм зімой . . . 41
Зімнія з’явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок) . . . 42




Правообладатель Народная асвета

## Вясеннія змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека


Ранняя вясна. Сакавік — першы месяц вясны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Асцярожна — крыгаход! Вясенні разліў рэк (паводка). Правілы паводзін каля вадаёмаў вясной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Вясна — час абуджэння раслін. Раннеквітнеючыя расліны — корм для насякомых . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Беражлівыя адносіны да першацветаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Выкарыстанне жыватворнай сілы прыроды вясной. Прагулкі і гульні ў парку, скверы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Бяспечныя месцы для гульняў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл вясной. Прылёт птушак . . . . . . . . . . . 50
Гнездаванне птушак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Змяненні ў жыцці насякомых і іншых жывёл вясной . . . . . . . . . . . . . . 52
Змяненні ў жыцці дзікіх звяроў вясной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Змяненні у жыцці свойскіх жывёл вясной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Праца людзей вясной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Уплыў людзей на жыццё раслін і жывёл. Неабходнасць аховы раслін, жывёл роднага краю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Вясеннія з’явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок) . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60


## Змяненні ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека летам


Змяненні ў нежывой прыродзе летам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Летнія навальніцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Расліны летам: цвіценне траў, паспяванне ягад . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
Ядавітыя расліны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Жыццё свойскіх жывёл летам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Жыццё дзікіх жывёл летам, іх клопат пра патомства . . . . . . . . . . . . . . 68
Ахова здароўя чалавека летам. Небяспечныя сітуацыі пры сустрэчы з ядавітымі раслінамі, са змеямі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Летняе загартоўванне арганізма. Правілы паводзін каля вадаёмаў і ў вадзе. Загар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Змяненні ў прыродзе і працы людзей у розныя поры года (абагульняючы ўрок) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74


## Чалавек і грамадства


Мой горад (мая вёска) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Правілы дарожнага руху . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Правілы пераходу вуліцы. Святлафор . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Я і мая сям’я. Значэнне сям’і ў жыцці чалавека . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
Правы і абавязкі дзяцей і бацькоў. Добразычлівыя адносіны ў сям’і . . . . 81
Небяспечныя сітуацыі дома . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Сігналы трывогі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83

Настаўніку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84




Правообладатель Народная асвета

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Удавічэнка** Валянціна Максімаўна
**Кавальчук** Таццяна Аляксандраўна

**ЧАЛАВЕК І СВЕТ**

Вучэбны дапаможнік для 1 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

2-е выданне, перапрацаванае

Загадчык рэдакцыі *В. Г. Бехціна.* Рэдактар *Н. М. Алганава.* Мастакі *В. Г. Крупенкава, Т. Я. Кудзіна, А. П. Макаўцоў, А. П. Пратасеня, Н. У. Сустава, А. Х. Угранінава.* Мастацкі рэдактар *А. А. Валатовіч.* Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплавоцкая.* Карэктары *К. І. Даніленка, Д. Р. Лосік, В. С. Бабеня, Г. В. Алешка.*

Падпісана ў друк 10.08.2012. Фармат 70 × 100 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Хеліос. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 8,45. Ул.-выд. арк. 6. Тыраж 21 400 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.


Правообладатель Народная асвета